Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя Ул. І. ЛЕНІНА

№ 39—40 (623) Пятніца 31 снежня 1965 г. Год выдання XVIII Цана 2 кап.




ДАРАГІЯ таварышы! Рэктарат, партком, камітэт камсамола, мясцком, прафком горача віншуюць усіх студэнтаў, аспірантаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў нашага універсітэта з Новым годам і жадаюць выдатных поспехаў у вучобе, працы, навуцы, шчасця ў асабістым жыцці.

Няхай 1966-ты год будзе для ўсіх вас годам новых вялікіх навуковых адкрыццяў, працоўных перамог, выдатных поспехаў у вучобе.

З Новым годам, таварышы!

## МАР'ЯН ДУКСА

*Гляджу на неба,*
*як на таямніцу,*
*І кліч вітальны*
*просіцца з душы.*
*Над галавой,*
*успыхнуўшы,*
*іскрыцца*
*Вуголле зорак*
*у старым каўшы.*
*Бывай, Стары!*
*Шчаслівага адлёту!..*
*Лугоў духмянасць*
*і азёраў сінь,*
*Мае трывогі,*
*песні і турботы,*
*Нібы легенду пра мяне,*
*нясі.*
*Не ведаў я*
*ні стомы, ні спакою —*
*Ад працы аж кругі плылі*
*ў вачах,*
*Каб з гонарам*
*і чыстаю душою*
*Было што несці сёння*
*на плячах.*
*Бывай, Стары!..*
*Ты падкаваў на шчасце*
*Багатую*
*і звонкую зіму.*
*А зараз дзверы*
*і вароты — насцеж*
*Расчынім*
*пераемніку твайму.*
*— Дзень добры, дзень,*
*што многа абяцае!*
*— Дзень добры,*
*сонца малады усход!..*
*І нада мной*
*зніжаецца, лунае,*
*Нібыта мірны голуб —*
*Новы год.*



мне, дапамагае ў працы. Калі я асвойвала новы метад даследаванняў, была прыемна здзіўлена, што ніхто з кафедры не пайшоў дадому, пакуль даследаванне не скончылася. І каб падбадзёрыць мяне пасля першых не зусім удалых навуковых спроб. Завада сказаў:

— Вельмі добра. Методыка доследаў здаецца простай, але я сам асвойваў яе не менш двух тыдняў.

Ва універсітэце вялікую ўвагу ўдзяляюць самастойнай працы студэнтаў. У вну краіны залічваюцца ўсе, хто жадае вучыцца. Экзамены здаюць па меры падрыхтоўкі на працягу ўсяго



семестра. Стыпендыі налічваюцца ў залежнасці ад паспяховасці. Вучышся лепш — стыпендыя большая, лянуешся — атрымай менш. Самая лепшая адзнака — адзінка, самая дрэнная — пяцёрка. Лекцыі чытаюцца на вельмі высокім навуковым узроўні.

Божа, як я загаварылася! Гадзіннік на Старамесцкай плошчы пачынае біць дванаццаць раз...»

Ідзе Новы год па зямлі. Год самых светлых мар і, будзем спадзявацца, самых добрых спраў.

Вечаслаў РАГОЙША і
Пятро РОГАЧ.

# НОВЫХ ПОСПЕХАЎ, НОВЫХ УДАЧ!

Новыя шляхі чакаюць вас, камсамольцы, у Новым годзе! Многія з вас напярэдадні яго перадалі эстафету добрых спраў у маладыя і надзейныя рукі тых, хто ўпершыню ў гэтым годзе пераступіў парог нашага універсітэта.

Першакурснік! Для цябе Новы год — гэта ў першую чаргу і твая першая ў жыцці сесія, першыя выпрабаванні на высокае права называцца студэнтам нашага універсітэта. Толькі тады ты будзеш лічыцца паўнапраўным членам нашай студэнцкай сям'і, калі з гонарам вытрымаеш свае першыя экзамены. Новы год няхай будзе таксама для вас і новым шчасцем і радасцю.

Вынікі летняй экзаменацыйнай сесіі паказваюць нам, што веды нашых студэнтаў сталі яшчэ больш трывалымі, яшчэ больш глыбокімі. Пераважная большасць студэнтаў па-камсамольску адносіцца да свайго галоўнага абавязку — да вучобы, выкарыстоўвае ўсе ўмовы, каб атрымаць максімум ведаў ва універсітэце. Так, з 3679 членаў ВЛКСМ 345 сталі выдатнікамі, 1235 атрымала выдатныя і добрыя ацэнкі. Наперадзе ў нас цяпер новыя клопаты новай сесіі. І камсамольцы ў першую чаргу павінны здаць яе, як мага лепш, каб быць вартымі павагі тых, хто працуе сёння на фабрыках і заводах, у калгасах і саўгасах, у школах і іншых галінах вытворчасці.

І добра, што добрых студэнтаў ва універсітэце сёння нельга пералічыць: іх сотні на кожным факультэце, простых, сціплых, таварыскіх. Мы з поўным правам ганарымся таварышамі, якія з года ў год спалучаюць выдатную вучобу з вялікай і актыўнай грамадскай дзейнасцю. За выдатную работу ў СНТ і за працы, якія атрымалі высокае прызнанне на Рэспубліканскім аглядзе, 57 студэнтаў нашага універсітэта ўзнагароджаны граматамі Міністэрства вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай і прафесіянальнай адукацыі БССР. Цяжка пералічыць усе добрыя справы камсамоліі універсітэта!

Дарагія камсамольцы! У Новым годзе вас чакае рамантыка студэнцкіх выпрабаванняў, вучоба, вытворчая практыка на вытворчасці, дыялекталагічная экспедыцыя — філолагаў, дальнія маршруты — географаў, археалагічныя раскопкі — гісторыкаў. Сваёй працай, сваёй вучобай памнажайце слаўныя традыцыі нашага універсітэта. Няхай жа 1-га студзеня стане для вас ракетадромам. Стартуйце сваімі няўрымслівымі сэрцамі да новых дасягненняў!

Камітэт камсамола віншуе ўсіх камсамольцаў, моладзь нашага універсітэта з Новым годам! Новых вам поспехаў у вучобе, шчасця ў асабістым жыцці, здзяйснення вашых крылатых мар!

КАМІТЭТ КАМСАМОЛА
УНІВЕРСІТЭТА.

# КУБА ВУЧЫЦЦА, ПРАЦУЕ, БУДУЕ САЦЫЯЛІЗМ

**Навагодняя свята для нас — двойчы свята. І студзеня Новага 1966 года — сем год Кубінскай Рэвалюцыі. За гэтыя гады нашаму народу прыйшлося агараць шмат цяжкасцей. Але краіна правяла эканамічныя, палітычныя і сацыяльныя пераўтварэнні. Быў знішчаны стары дзяржаўны апарат, створана Народная армія, зямля аддадзена сялянам, нацыяналізаваны латыфундыі, фабрыкі, заводы і банкі, царква аддзелена ад дзяржавы і школы.**

**Паспяхова справіўся кубінскі народ з рашэннем дзвюх неадкладных задач: з ліквідацыяй непісьменнасці і абаронай сацыялістычнай Радзімы.**

**Больш 110 юнакоў і дзяўчат уліліся ў брыгады, якія на працягу васьмі месяцаў вучылі насельніцтва. З братняй дапамогай сацыялістычных краін і асабліва Савецкага Саюза — «краіны гігантаў», як назваў яго Фідэль Кастра, наш народ дабіўся значных поспехаў як у абароне Кубінскай Рэвалюцыі, так і ў будаўніцтве сацыялізма ў першай сапраўды свабоднай краіне Лацінскай Амерыкі.**

**У 1965 годзе мы паспяхова ўбралі цукровы трыснёг, прадукцыя якога склала больш шасці мільёнаў тон цукру. Нямалая заслуга ў гэтым савецкіх камбайнаў.**

**Куба — вучыцца, працуе, будуе сацыялізм! Яна сёння гатова дапамагаць усім народам, якія змагаюцца супраць каланіялізму, імперыялізму, за свабоду, за светлае будучае чалавецтва. Мы горача вітаем народы Паўднёвага В'етнама, Конга, Венесуэлы і іншых краін, якія вядуць справядлівую барацьбу за сваё вызваленне.**

**Мы па-братэрску, сардэчна вітаем савецкі народ, віншуем ўсіх савецкіх людзей з Новым годам, жадаем ім новых поспехаў у будаўніцтве камунізма!**

Эрнеста ФАРЫНЕС,
прэзідэнт зямляцтва кубінскіх
студэнтаў падрыхтоўчага
факультэта.

# ФОТА-РЭПАРТАЖ ДЗЕДА МАРОЗА





# ТАЖ ДЗЕДА МАРОЗА







**УЛАДЗІМІР ДЗЮБА**

*Сабе снягурачку
зляплю
Удалечыні ад злога
вока,
Няўрымслівую
палюблю,
Хоць палюбіць зіму...
нялёгка.
Не палічыце ж вы
за грэх,
Калі ў мароз ці
завіруху
Снягурачку я буду
грэць
І думаю,
што не патухну!..*




## ОЙ, НОЧ, ЯК ТЫ СМАЧНА!



**...Чырвонае лета!**
**Твая ноч каротка,**
**Але і салодка.**
**Рыгор Семашкевіч.**

Ох, ноч, як ты смачна!
Як я табе ўдзячны!
Хоць ты і каротка,
Але і салодка.
Малінава, спела,
Наіўна, нясмела,
Чырвона, крамяна,
Сіропна — духмяна.
Так пахла табою
Спакусна — спакусна,
Што нават зімою
Аблізваю вусны.

⊙

**...з зялёнага ракетадрома**
**стартуюць сосны...**
**Юрка Голуб.**

У бянгальскіх агнях,
у громе
(Ох, які фейерверк!)
З снежнага хвоедрома
Сосны...
шугалі ўверх.
Сеў я хутчэй...
у елку,
Сукі — рычагі
вярчу,
Іголкі — прыбораў стрэлкі.
Птушкаю
ў друк лячу.



## НЕАБЧЭСАНЫЯ ПАЦАЛУНКІ

**...нібы верставыя слупы,**
**пацалункі твае страчаю...**
**Хведар Чэрня.**

*Калашмаціла ветрам чуб,*
*Я ў рэдакцыю шпарка крочыў*
*І на твой пацалунак — слуп,*
*Заглядзеўшыся ўверх, наскочыў.*
*У вачах паплылі кругі,*
*Ледзьве вызначыў зноў кірунак,*
*А па шчэлепах — плясь другі!*
*Неабчэсаны пацалунак.*
*А затым пацалунак — кій.*
*Ад пачуццяў гарачых плачу.*
*Не цалуйся, прашу, пакінь,*
*А не то я прытомнасць страчу.*



## ВОСЬ РОГАТУ БЫЛО Б



**...калі б павысыхалі акіяны...**
**Уладзімір Дзюба**

Вось рогату было б, каб акіяны
Усе дашчэнту раптам асушыць,
Зраўняць з Палессем
Альпы і Саяны
Лясы панішчыць,
сонца патушыць.
Не засталося б ні зімы, ні лета,
Ні зубра, ні бабра, ні вераб'я.
Плыла б пустэльнай,
што была сусветам,
Бясконцая фантазія мая.

## НА КОНІКУ-КОЛІКУ



**...каню — прастор!**
**каню — дарогу!..**
**Мікола Лісоўскі.**

Крычу на ўсю:
— Каню дарогу!
Конь з галавой,
але бязногі.
Вось на такім,
браток,
кані.
Ты Лось
ці Танка
дагані.

## ПАЭЗІЯ МАЎЧАННЯ

**...Слова — срэбра,**
**маўчанне — золата...**
**Пятро Сушко**

Не чакайце шэдэўраў.
Дудкі!
Не хачу іх пісаць —
і кропка,
Пахаваю навечна
думкі
Пад сваёй
чарапной каробкай.
Скамянею
маўклівым волатам,
Сэрца сціснуўшы
моцна ў рэбрах,
Каб гарачых пачуццяў
золата
на паперы
не стала
срэбрам.



# Бянтэжанне

**...прыйшоў і ўвесь**
**збянтэжыўся...**
**Мар'ян Дукса**

*З'явіўся, як з'яўляліся*
*на белы свет усе.*
*Бянтэжыў белы свет мяне*
*спачатку пакрысе.*
*Гляджу — сасняк жаўтачкаю*
*хварэе па вясне—*
*Бянтэжанне гарачае*
*прабегла па спіне.*
*Убачыў шчасцем поўную*
*варону на кусце —*
*Бянтэжанне чароўнае*
*прайшло па жываце.*
*Іду далей на дыбачках,*
*карлюку-вербалоз*
*абнюхваю —*
*уздрыгвае*
*Збянтэжаны мой нос.*
*Бусліха з буслам, —*
*ліха ім!—*
*палезлі аж на дуб,*
*—Чым там займацца*
*думаюць?—*
*Бянтэжыцца мой чуб.*
*І сам угору лезу я,*
*аж заціхае дух.*
*Нага ж мая бянтэжыцца —*
*Я да паднsocha — бух!*
*Мне шлёпаюць далонькай.*
*І вось пішу я днесь,*
*Загорнуты ў пялёнкі,*
*Збянтэжаны — увесь.*



# ЁЛАЧКА

У цёмным лесе ёлачка,
Ля ёлачкі сляды:
Паэты і празаікі
Спяшаюцца сюды.
Няўрымслівыя,
Жвавыя,
Усе, як на падбор,
Па ёлку навагоднюю
Прыйшлі ў зялёны бор.
Узросту людзі рознага,
Я не лічыў гады,
Адно скажу, што кожны з іх
Быў сэрцам малады.

З сякераю па ёлачку
Ішоў па лесе ТАНК,
Але, яе пабачыўшы,
Рашыў — разважыў так:
— Жыві — красуйся, ёлачка,
І летам і зімой.
Губіць вечназялёную
Надзённы хлеб — не мой.
Ты ў сэрца мне навеяла
Зімовы ціхі сум,
Адсюль у наша «Полымя»
Лірычнасць панясу.

«Паэма майго лесу ты, —
Ей ПАНЧНАКА сказаў,
І лапачку калючую
Пяшчотна цалаваў.

І БРОЎКА, моцна ўражаны,
Зваліць яе не змог,
Сказаў:
— Расці высокая!
Трубі ў ласіны рог!
Няхай твае іголачкі
Шчаслівыя гудуць,
Мне ж пажадай сто кніг стварыць
Накшталт «А дні ідуць...»

ЛОСЬ, глянуўшы на ёлачку
Ускінула брыво
І прашаптала радасна:
—Вось гэта — хараство!

Глядзіць БІЧЭЛЬ-ЗАГНЕТАВА:
Не Нёман — снег ідзе,
Ды толькі каля ёлачкі
Не горш, чым на вадзе.
І вершы добра пішуцца,
І дрэўцы ўверх ідуць.
Глядзіш, яшчэ і прэмію
За зборнічак дадуць.

Журбою БАРАДУЛІНА
Крануў зялёны бор,
Рыгор не стаў сякераю
Пабольшваць бораў боль.
МАКАЛЬ з халоднай зброяю
Да ёлачкі не лез:
Зялёнай асамблеяю
Яму здаваўся лес.

Тут ПЫСІН пад арэшынай
Любімым калісь быў,
Ліў слёзы пад вярбінаю,
Пад вязам сам любіў,
Кране рукой галіначку
І сэрца забаліць.
Ну, як жа тут ялінaчку
Сякераю валіць?

ГЕНАДЗЬ БУРАЎКІН З
ПАЎЛАВЫМ
Прыйшлі сюды з пілой,
Ды не кранулі ёлачкі:
Шкада яе было.
Прасілі хлопцы ёлачку:
— Натхнення болей дай,
І ў прозе і ў паэзіі
Нам шчасця пажадай.

Прасіў ШАМЯКІН ёлачку:
— Шумні ты чытачу,
За «Сэрца на далоні» я
Нічога не хачу.
Што на мяне разлічана,
На іншых лепш патраць,
Адну я маю прэмію,
Магу і пачакаць.

Сказаў ёй МЕЛЕЖ:
— Будзема
Знаёмы.
Я — Іван.
Людзей з балота вывеў я
І выпусціў раман,
Навей жа, прыгажэйшая
З зялёных чараўніц,
І зімкаю халоднаю
Мне подых навальніц.

ПІЛІП ПЕСТРАК над ёлачкай
Зняў з галавы убор
— Ці не пайшла б ты, ёлачка,
У мой «Серадзібор»,

Ішоў па ёлку САЧАНКА
Дарогай цераз лес.
Сустрэў бадзяга-дзік яго,
Барыс на сук залез.
Зямлёю продкаў Сачанку
Прыйшлося прысягаць,
Што болей ён на ёлачку
Не будзе пасягаць.

ГІЛЕВІЧ, каб бяды не мець,
Сякеры не ўзнімаў,
Адно да новых венікаў
Мяцёлку наламаў.
Сказаў:
— Хіба ж узнімецца
На гэткую рука? —
І прачытаў напамяць ёй
Тры вершы з «Бальшака».

ВАСІЛЬ ЗУЁНАК ёлачкі
Не крыўдзіў ані-ні,
А толькі дзве крывуліны
Зваліў на капані.
Крысом кашулі выцершы
На твары буйны пот,
Пачаў рабіць ля ёлачкі
Вясёлы калаўрот.

СЯРГЕЙ ДЗЯРГАЙ на ёлачку
Замаху не рабіў,
Прыдумаў карацелечку
І тым шчаслівы быў.

АСТРЭЙКА слуцкім поясам
Яе падперазаў,
Цікавенькую казачку
ШУШКЕВІЧ расказаў.
Усе за ручкі ўзяўшыся,
Спявалі:
— Баю — бай!
На вочы злосным крытыкам,
Глядзі, не пападай.
Пятро СУШКО.

Рэдактар А. ЛОЙКА.

Адрас рэдакцыі: г. Мінск, БДУ імя Ул. І. Леніна, галоўны корпус, п. 212, тэл. 2-07-19. Друкарня выдавецтва «Звязда». Зак. 1438. АТ 10448